**С. Я. Новікаў**

# 20-ГАДОВЫ РУБЕЖ КРАСАВІЦКІХ СУСТРЭЧ: ГАЛОЎНЫЯ ВЫНІКІ І НОВЫЯ ВЫКЛІКІ

*Светлай памяці* ***Сяргея Паўлавіча Кубекі*** *–*
*Сябра і Калегі*

Красавіцкія сустрэчы ў МДЛУ! Пад такой назвай яны ўсё часцей згадваюцца ў колах ваенных гісторыкаў, архівістаў і даследчыкаў у Беларусі і Германіі, Польшчы і Расіі, Латвіі і Украіны. Пачатак такім сустрэчам быў пакладзены рэспубліканскай канферэнцыяй, праведзенай 20 гадоў назад і прысвечанай 10-годдзю ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Федэратыўнай Рэспублікай Германія. У звароце рэдакцыйнай калегіі да аўтараў першага зборніка матэрыялаў прагучала дальнабачнае пажаданне – закласці **традыцыю** па рэгулярным правядзенні навуковых канферэнцый «Беларусь і Германія» [1, с. 3]. Два дзесяцігоддзі, якія мінулі з таго часу, пераконваюць, што яна заслужана ўвайшла ў найноўшую беларускую гісторыю як **важнейшая міжнародная дыскусійная пляцоўка.** Якая ж яна ў плане атрыманых вынікаў і гатоўнасці да новых выклікаў гісторыі?

Цяперашняя канферэнцыя ладзіцца напярэдадні 80-х угодкаў пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Аднак аргкамітэт вырашыў прысвяціць 20-ю сустрэчу не менш важнай даце – **20-годаваму юбілею Цэнтра беларускай мовы**

**і культуры**! Вось так збег гістарычнага часу даў нам шанс спаткання дзвюх круглых дат, звязаных гісторыяй самога Цэнтра і штогадовых сустрэч у ім удзельнікаў міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларусь і Германія гісторыя і сучаснасць" [2; 3; 4; 5; 6; 7; 8; 9; 10; 11; 12; 13]. За гэтыя гады аўдыторыя А 213 таксама падаравала кожнаму з нас атмасферу радасці і ўтульнасці, камфорту і шчырасці, адкрытасці і павагі, беларускасці і іншамоўнасці, еўрапейскай міжкультурнай камунікацыі, а галоўнае – пераўтварылася ў **незаменную пляцоўку** гарачых дыскусій, апрабацыі атрыманых даследчыцкіх вынікаў і прадстаўлення важных знаходак.

Аналізуючы мінулыя сустрэчы, у п е р ш а ю чаргу адзначым, што за 20 гадоў канферэнцыя "Беларусь і Германія" набыла рысы адметнай **гістарыяграфічнай з'явы** дзякуючы створанай за гэты час дыскусійнай пляцоўцы, якая ўносіць свой пэўны ўклад у айчынную і замежную гістарыяграфію; на кніжныя паліцы, найперш нацыянальных бібліятэк Рэспублікі Беларусь і Федэратыўнай Рэспублікі Германія (Deutsche Nationalbibliothek in Leipzig und Frankfurt a.M.), трапляюць і штогод новыя выпускі матэрыялаў канферэнцыі. Разгляд геаграфіі ўдзелу паказвае, што другое дзесяцігоддзе дадало да папярэдніх васьмі назваў краін (Аўстрыя, Беларусь, Германія, Латвія, Літва, Польшча, Расія і Украіна) толькі адну – Вялікабрытанію.

Колькасны фармат удзельнікаў можна вызначыць праз агульны лік надрукаваных дакладаў, выступленняў і паведамленняў. За два дзесяцігоддзі ён перавысіў лічбу 800. Гэта азначае, што ў сярэднім на дзесяцігоддзе прыпадае каля 400 публікацый. Спасылкі на іх можна сустрэць у доктарскіх, кандыдацкіх і магістарскіх даследаваннях, аўтарскіх і калектыўных манаграфіях, навуковых артыкулах розных жанраў і рознага кшталту (адпавядаючых патрабаванням беларускай ВАК, расійскага РИНЦ, сусветнай базы даных Scopus і інш.), а таксама ў шматлікіх тэзісах дакладаў і зборніках навуковых прац. Апроч беларускай гістарыяграфіі згадкі пра матэрыялы канферэнцыі сустракаюцца ў найноўшых англійскай і амерыканскай, аўстрыйскай і германскай, ізраільскай і польскай, латвійскай і літоўскай, расійскай і ўкраінскай гістарыяграфіях. Прафесійны склад канферэнцыі фарміруюць перш за ўсё гісторыкі, а таксама сацыёлагі, палітолагі, эканамісты, культуролагі, мастацтва- і музеязнаўцы і іншыя спецыялісты ў галіне беларуска-германскіх адносін. На падставе гэтага можна сцвярджаць, што апублікаваныя матэрыялы канферэнцыі з'яўляюцца неад'емнай **часткай сучаснага сусветнага гістарыяграфічнага працэсу**!

Д р у г о й важнай адметнасцю нашых сустрэч цягам 2010-х гадоў з'явілася вызначэнне галоўнай тэматычнай дамінанты – **ваеннае беларусазнаўства**, да якога спрычынілася абсалютная большасць айчынных і замежных удзельнікаў канферэнцыі. Гісторыкі, архівісты, музеязнаўцы ўносяць свой значны ўклад у агульную скарбонку сучаснай ваенна-гістарычнай навукі Беларусі, адлюстроўваючы ў сваіх працах шырокі спектр гераічнай і трагічнай тэматыкі, захоўваючы памяць аб трагічным лёсе беларусаў, людзей розных нацыянальнасцей, у тым ліку савецкіх ваеннапалонных на

беларускай зямлі. Таму не з'яўляецца выпадковым, што сярод даследчыцкіх задач, якія вырашаліся падчас сустрэч, асаблівая ўвага надавалася **пошуку новых навуковых падыходаў** да вывучэння найбольш складаных аспектаў гісторыі Беларусі і Германіі ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

У якасці т р э ц я й важнай адметнасці неабходна вылучыць тое, што пленарныя пасяджэнні практычна кожнай канферэнцыі станавілася **пляцоўкай для апрабацыі** атрыманых даследчыцкіх распрацовак у галіне ваеннай гісторыі Беларусі. У першую чаргу размова ідзе пра тэмы доктарскіх работ, якія выконвалі ці працягваюць іх выкананне беларускія гісторыкі – Я. А. Грэбень, У. В. Здановіч, А. І. Корсак, А. У. Ціманава; дактаранты з Германіі – А. М. Белановіч-Пэтц, Крысціян Ганцар, Крысціна Князеў, а таксама Зміцер Панцьё з Польшчы. На канферэнцыях таксама адбывалася абмеркаванне вынікаў кандыдацкіх даследаванняў беларускіх аспірантаў і саіскальнікаў па тэматыцы ваеннай гісторыі Беларусі: І. А. Валынкіна, А. М. Дакуновай, В. П. Дзмітрыева, І. Я. Кураковай, П. А. Канцавога, Д. Г. Кіенкі, Ю. У. Матусевіч, Н. А. Шыманскай, А. І. Яўстрацьева. Адзначым той факт, што большасць з іх за гэты час паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі, хтосьці знаходзіцца на завяршальным этапе праведзення даследаванняў. Пажадаем ім поспехаў.

Наступная важная адметнасць сустрэч набыла асаблівае значэнне дзякуючы таму, што пленарныя пасяджэнні, дзе ўсё часцей гучалі выступленні на даволі вострыя пытанні айчыннай гісторыі, фарміравалі таксама **пляцоўку для навуковых дыскусій**. Яны распачыналіся практычна адразу пасля агучвання смелых ацэнак або вынікаў праведзенага крытычнага аналізу фактаў гісторыі Беларусі: для пошуку гістарычнай ісціны ставіліся вострыя пытанні, шукаліся абгрунтаваныя адказы, уводзіліся малавядомыя дакументы з мэтай адыходу ад традыцыйнага наратыву і набліжэння да аб'ектыўных гістарычных ведаў. Школу навуковага абмеркавання рэальных гістарычных фактаў пастаянна дэманстравалі беларускія гісторыкі Я. А. Грэбень, І. М. Кузняцоў А. М. Ліцвін і нашы замежныя госці: Ю. З. Кантар (Санкт-Пецярбург, Расія), К. Зеліс (Рыга, Латвія), К. Ганцар (Ляйпцыг, Германія), З. Панцьё (Гданьск, Польша), К. Янеке (Берлін, Германія).

Пералік адметнасцей можна працягваць на прыкладзе аналізу кожнай праведзенай канферэнцыі, геаграфіі яе ўдзельнікаў, тэматыкі выступленняў, рэзультатаў абмеркавання, прадстаўлення новых знаходак і г.д. Для падрабязнага разгляду вынікаў спатрэбілася б цэлае пленарнае пасяджэнне. Таму пакуль пакінем спіс адкрытым. А ў канцы нашага абагульняючага аналізу звернем увагу ўдзельнікаў канферэнцыі на не менш важны момант, звязаны з тым, што цягам трох апошніх сустрэч у рамках праграмы правядзення канферэнцый заключныя пленарныя пасяджэнні мы прысвячаем ушанаванню памяці аб нашых калегах, якія заўчасна пайшлі з жыцця. Гэта нямецкі гісторык з мюнхенскага Інстытута сучаснай гісторыі, намеснік рэдактара “Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte” доктар філасофіі Юрген Царускі; рэцэн-

зент першых выданняў зборніка "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць", шматгадовы сябра арганізацыйнага камітэта і рэдакцыйнай калегіі, доктар гістарычных навук, прафесар Анатоль Васільевіч Шаркоў; адзін з заснавальнікаў канферэнцыі, шматгадовы сябра арганізацыйнага камітэта старшы выкладчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Сяргей Паўлавіч Кубека. Як кажуць, не мы выбіраем час, а час выбірае нас.

Час не толькі выбірае, але і ставіць нас перад новымі выклікамі. Для арганізатараў канферэнцыі гэта вельмі важныя задачы: аб вызначэнні найбольш адэкватнага фармату сустрэч, спалучэнні тэматычных палёў, увядзенні электроннага выдання навуковых матэрыялаў, а таксама аб удасканаленні метадалогіі даследаванняў.

У першым выпадку фармат сустрэч вынікае з факта сталага ўдзелу ў канферэнцыях замежных гісторыкаў, галоўным чынам з Германіі, Латвіі, Польшчы, Расіі. Гісторыкі замежных краін пастаянна дэманструюць новыя вынікі праведзеных даследаванняў, спрабуюць усебакова асэнсаваць ваенныя падзеі ў Беларусі, часам з выкарыстаннем прынцыпова іншых падыходаў у параўнанні з беларускімі навукоўцамі, атрымліваючы нават процілеглыя ацэнкі ў дачыненні да адных і тых жа падзей, прынятых у айчыннай гістарыяграфіі. Для сучаснай беларускай гістарычнай навукі вынікае вельмі важная задача па выпрацоўцы навуковай метадалогіі з улікам новых замежных распрацовак. Або ў новых працах зноў будуць заставацца традыцыйныя савецкія штампы аб "фальсіфікацыі гісторыі" і заідэалагізаваныя ацэнкі ваеннага мінулага, або пачнецца пошук адэкватных адказаў з выкарыстаннем дакументальных крыніц featureрознага паходжання.

У кантэксце такога падыходу беларускім гісторыкам нельга пакідаць па-за ўвагай **германскую ваенную гістарыяграфію,** якая на цяперашні час прадстаўлена дзясяткамі грунтоўных навуковых прац і шэрагам спецыяльных даследаванняў па ваенным беларусазнаўстве: у іх знайшлі адлюстраванне галоўныя напрамкі і найноўшыя тэндэнцыі ў вывучэнні шырокага спектра беларускай ваеннай праблематыкі. Таму для сучаснай айчыннай гістарычнай навукі неабходна зыходзіць з таго факта, што германская ваенная гістарыяграфія не вылучаецца ў якасці нейкай унутранай навуковай з'явы, а наадварот, існуе ў кантэксце адзінай сусветнай ваеннай гістарычнай навукі. Таму нам неабходна не толькі ведаць працы нямецкіх даследчыкаў, але імкнуцца як мага хутчэй сінтэзаваць тыя дасягненні, якія на цяперашні дзень дала германская ваенная гістарыяграфія. І для айчынных гісторыкаў не павінна існаваць нейкай адной тэорыі пазнання, захавання толькі зададзеных раней установак пры правядзенні даследаванняў. Неабходна думаць пра пошук новых метадалагічных падыходаў і спробы новага пераасэнсавання ваеннага мінулага, а не яго перапісвання. Відавочна, што нам неабходна імкнуцца аднавіць поўную карціну падзей, у тым ліку на аснове абавязковага выкарыстання замежных дакументальных крыніц і спецыяльных навуковых прац.

Цяперашні навуковы дыскурс патрабуе, каб на першым месцы стаяла праблема суадносін дакументальных крыніц, ці гістарычнай рэчаіснасці, і гістарыяграфічнага наратыву. Увядзенне ў апошнія гады ў шырокі зварот вялікай колькасці арыгінальных дакументаў і матэрыялаў, пра што сведчаць шматлікія выданні аддзела публікацый НАРБ і ІГ НАН Беларусі, патрабуе больш актыўнага выкарыстання метаду параўнаўчага аналізу, асабліва ў раскрыцці поўнай карціны двухбаковых баявых дзеянняў германскага вермахта і Чырвонай арміі на вызваленчым этапе вайны, выяўлення ў паўсядзённай ваеннай гісторыі Беларусі тыповых і адметных фактаў, на падставе чаго можна будзе павялічыць значэнне мінулага для яго сучаснай інструменталізацыі ў сферы навукі, адукацыі, выхавання. Патрэба ў гэтым у апошні час стала больш чым відавочнай. Гэта выводзіць нас на пошук не толькі ключавых, але і дадатковых крытэрыяў для вядзення сапраўднага гістарычнага дыскурсу. Тут не абысціся і без наватарскіх прыёмаў апісання падзей, разгляду скрозь прызму крытычнага аналізу традыцыйных падыходаў дзеля ліквідацыі аднабаковага паказу гістарычных падзей. Як высвятляецца, нас чакае праца па стварэнні новага каркаса гістарычнага наратыву на аснове выключна аб'ектыўных ведаў і ўсебаковага аналізу. Аднабаковасць на цяперашні час вяртае ваенных гісторыкаў да паўтарэння ацэнак савецкага часу, без іх крытычнай і ўзважанай ацэнкі. Рэальная сітуацыя ў сучаснай ваенна-гістарычнай навуцы патрабуе дакладнай і глыбокай інтэрпрэтацыі фактаў ваеннай гісторыі Беларусі, у першую чаргу ў вымярэнні людскіх выпрабаванняў на акупаванай беларускай тэрыторыі, наступстваў генацыду, Халакосту, лёсу савецкіх ваеннапалонных, а таксама пошуку найбольш адпаведных форм, у тым ліку сумесных, для фарміравання адэкватнай культуры памяці пра падзеі вайны.

Як вынік неабходна прызнаць, што патрабуецца сапраўднае майстэрства ад гісторыка для таго, каб раскрыць рэальную гістарычную сітуацыю і паказаць падставы для ўстанаўлення арганічнай узаемасувязі падзей. Выяўляючы агульнае і адметнае ў ваеннай гісторыі Беларусі, перш-наперш беларускія і нямецкія навукоўцы могуць садзейнічаць больш глыбокаму ўсведамленню і дакладнай фіксацыі ўнікальнасці гістарычных з'яў вайны і акупацыі, без чаго нельга ўсебакова прадставіць гістарычны наратыў гісторыі Беларусі ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

У заключнай частцы выступлення ад імя аргкамітэта хачу выказаць шчырую падзяку ўсім удзельнікам штогадовых канферэнцый за падоранае багацце шчырага суразмоўя, якое стала бясцэнным за гэтыя гады, асабліва ў час пандэміі, і за здольнасць пераадольваць штучныя межы, што выраслі паміж краінамі, але не людзьмі. Самая шчырая ўдзячнасць кожнаму з удзельнікаў за інтарэс і прафесійную падтрымку, без якой канферэнцыі не было б як факта найноўшай гісторыі Беларусі і Германіі. Вялікую падзяку адрасую калегам па кафедры за невычарпальную энергію, усебаковую падтрымку і прафесійнае паразуменне.

Сардэчную падзяку ўдзельнікі выказваюць у адрас супрацоўнікаў рэдакцыйнай групы, групы камп'ютарнай падрыхтоўкі рукапісаў і паліграфічнага ўчастка: яны заўсёды імкнуліся своечасова правесці рэдагаванне аўтарскіх тэкстаў, якасна падрыхтаваць іх да друку ў адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі; а таксама бездакорна рабілі справу па прыгожым аздабленні і выданні (толькі за апошняе 10-годдзе) 9 зборнікаў матэрыялаў (асобныя з іх у дзвюх частках) агульным аб'ёмам у 149,52 друкаваных аркушаў.

Асаблівую ўдзячнасць выказваю **Наталлі Пятроўне Баранавай** за шматгадовую падтрымку гэтага важнага навуковага праекта: яго ўдзельнікі не раз усцешваліся тым, што народжаная ў душы і сэрцы ініцыятыва гісторыкаў універсітэта не была згорнута, не згінула ў імклівай віхуры паўсядзённых вучэбных спраў, а пераўтварылася ў штогадовую традыцыю навуковых сустрэч гісторыкаў розных краін у МДЛУ.

А заключныя словы сяброўскіх віншаванняў у сувязі з юбілеем адрасую гаспадыням Цэнтра беларускай мовы і культуры, супрацоўніцы якога штогод стала рупіліся занатаваць кожную падзею, дату, сустрэчу ў сваім унікальным летапісе. Падзяка ўсім, хто самааддана спрычыняўся да гэтай важнай справы. Супрацоўнікам Цэнтра так трымаць надалей, радаваць чытачоў новымі выставамі, кнігамі, дакументамі: гэта на цяперашні момант заслугоўвае самай шчырай падзякі, павагі, пашаны. Ад аргкамітэта канферэнцыі і яе ўдзельнікаў выказваю сардэчныя пажаданні паспяхова крочыць да чарговага юбілею, зберагаць традыцыі і захоўваць наватарскі падыход да спраў!

Дзякуй за ўвагу!

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы навук. канф., Мінск, 24 мая 2002 г. / гал. рэд. У. Ф. Ладысеў. – Мінск : МДЛУ, 2002. – 194 с.
2. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 6 крас. 2012 г. : у 2 т. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2013. – Вып. 11. – Т. 1. – 248 с.
3. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 6 крас. 2012 г. : у 2 т. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2013. – Вып. 11. – Т. 2. – 120 с.
4. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 5 крас. 2013 г. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2014. – Вып. 12. – 280 с.
5. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 11 крас. 2014 г. : у 2 т. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2015. – Вып. 13. – Т. 1. – 180 с.

6. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 11 крас. 2014 г. : у 2 т. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2015. – Вып. 13. – Т. 2. – 160 с.
7. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 10 крас. 2015 г. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2016. – Вып. 14. – 304 с.
8. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 8 крас. 2016 г. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2017. – Вып. 15. – 248 с.
9. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 14 крас. 2017 г. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2018. – Вып. 16. – 288 с.
10. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 6 крас. 2018 г. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2019. – Вып. 17. – 272 с.
11. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 5 крас. 2018 г. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2020. – Вып. 18. – 224 с.
12. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 3 крас. 2020 г. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2021. – Вып. 19. – 248 с.
13. Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: праграма 20-й Міжнар. навук. канф., Мінск, 2 крас. 2021 г. / укл. С. Я. Новікаў. – Мінск : МДЛУ, 2021. – 10 с.